**Раманоўская Т.М.,** студ. гр. 302а БДУКМ
Навук. кір. – Друк Г.М.,
кандыдат філалагічных навук, дацэнт

# ТВОРЧЫЯ ПОСТАЦІ Ў ПАЭЗІІ У. КАРАТКЕВІЧА (НА МАТЭРЫЯЛЕ ЗБОРНІКА “БЫЎ. ЁСЦЬ. БУДУ…”)

Творчасць У.Караткевіча – неабсяжны свет, у які заўсёды хочацца вяртацца, каб глыбей спасцігаць сэнс створанага пісьменнікам. Зборнік паэзіі “Быў. Ёсць. Буду” з’яўляецца адным з прыкладаў плённага выкарыстання аўтарам беларускага фальклору, біблейскіх традыцый, духоўна-творчага вопыту ўсяго чалавецтва. Заўважана, што адзін з мастацкіх тыпаў героя У. Караткевіча – рэальна дзеючая ў гісторыі асоба, якая вылучаецца высокай маральнасцю, глыбокім гуманізмам, пазначана сапраўдным талентам, нават геніяльнасцю. У такім вобразе ўвасабляюцца трагічныя супярэчнасці самога часу, калі чалавеку даводзіцца праз свой выбар сцвярджаць агульначалавечыя каштоўнасці, быць сувязным розных эпох, культурных традыцый.

Адным з такіх герояў у паэзіі У. Караткевіча з’яўляецца беларускі акцёр, рэжысёр, тэатральны дзеяч, заснавальнік першага прафесійнага нацыянальнага беларускага тэатра – І.Ц.Буйніцкі. Верш «Шляхамі Ігната Буйніцкага» распавядае чытачу аб культурным значэнні той працы, якую вёў І.Буйніцкі, аб высакароднасці душы гэтага дзіўнага чалавека, які рэалізоўваў ідэю стварэння «тэатра для простых людзей». Мастацкія прыёмы градацыі і кантрасту, паўтораў рэалістычна выяўляюць жыццёвы драматызм таго шляху, якім ішоў Буйніцкі: «Па пясчаных дарогах, па гразкіх дарогах, // Па дарогах, якім канца не відаць...// Зверху хмараў чароды. // Знізу – хвалі разлогаў. // Зверху хвошча вада. // Знізу плешча вада…» [1, с. 27]. І.Буйніцкі наладжвае сваю дзейнасць у складаны для Беларусі час, калі ад кожнага патрабуецца актыўны ўдзел у гістарычным працэсе, змаганне за

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нацыянальную незалежнасць і дэмакратычныя асновы жыцця. Спрабуючы асэнсаваць веліч зробленага І.Буйніцкім, У.Караткевіч выклікае чытача на палемічны роздум:

Пан каморнік! Куды?
Каму гэта трэба?
Што звычайным хлопам гэтых краёў,
Ім, якія жывуць без імя і неба, –
Тыя песні твае, тое слова тваё?!

Што ім тая забытая дзіўная вера…
Лепш бы ты, як раней, межаваў палі
І стараўся даць ім -- судом і мерай --
Хоць валоку якую панскай зямлі.

Што ім іхні лёс,
Вялікі й суровы?
Што ім, -- мо ўжо адкажаш нарэшце ты, --
Да загнанай, забітай, задушанай мовы,
Іх вялікасць першы вандроўны артыст?.. [1, с. 27].

Верш "Шляхамі Ігната Буйніцкага" – дыялог стваральнікаў культуры розных эпох, у якім з болем за сучасніка і захапленнем самаахвярнай працай папярэднікаў гучыць голас Караткевіча. Спроба сцвердзіць духоўным набыткам чалавека развітую нацыянальную свядомасць узвялічвае асобу І.Буйніцкага ў часе: «І гарэць той славе, нятленнай, шырокай // Да апошніх, бязведамных нашых вякоў // За адну тваю спробу замест валокі // Мову людзям вярнуць і зямлю бацькоў…». Гуманістычная ў сваёй аснове пазіцыя такой асобы вядзе да кроку наперад у гісторыі не толькі асобнай нацыі, але і ўсяго чалавецтва.

З ліку падобнага тыпу гуманістаў – творчая постаць М.Багдановіча, да якога У.Караткевіч звяртаўся ў вершах "Багдановічу", "Домік Багдановіча",

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

артыкуле “Багдановіч і сучаснасць”. На думку пісьменніка, Максім Багдановіч даў беларусам першы ўрок гісторыі, але яго слава як прадстаўніка мастацтва і агульначалавечай культуры – неўміручая, яна перарастае межы нацыянальнага, яе святлу “пазайздросцяць і космас, і людзі, і бог” [1, с. 72]. Наведванне магілы М.Багдановіча развярэдзіла ў душы У.Караткевіча боль па праблеме гістарычнага бяспамяцтва:

Кажуць, разбураць цябе. Але хай сабе новая рана,
Хай справядлівасць яшчэ раз будзе стаптана ў жыцці, --
Гэты маленькі дамок праз акно тваёй ночы астанняй
Будзе да скону зямнога ў вечнасць нашчадкам свяціць [1, с. 72].

У гэтым вершы і ў іншых творах У.Караткевіча духоўнасць выступае крытэрыем вызначэння чалавечага ў чалавеку. Цікавай падаецца гісторыя, якая лягла ў аснову верша «АфіцэруЛісаневічу». Яна наўпрост звязана з асобай маладога М.Ю. Лермантава. Некалькі гадоў ён жыў у Пяцігорску, дзе паэта вельмі не любілі за рэзкасць і вастрыню мовы, за самабытнасць і самастойнасць меркаванняў, за славу. Некаторыя з уплывовых асоб чакалі выпадку, калі хто-небудзь, выведзены з цярпення, правучыць, па іх словах, «нязноснага выскачку і задзіраку» [2, с. 119]. «Як у падобных выпадках гэта бывала не раз, – піша даследчык П.А. Віскаваты, – шукалі якую-небудзь падстаўную асобу, якая, сама таго не падазраючы, з'явілася б выканаўцам задуманай інтрыгі» [3, с.118]. Такой «асобай» павінен быў стаць аднагодак Лермантава, сын ваеннакамандуючага, прапаршчык Эрыванскага карабінернага палка С.Д. Лісаневіч, які часта зведваў на сабе выхадкі Міхаіла Юр’евіча. Лісаневічу праз некаторых паслужлівых людзей было сказана, што пазбавіцца Лермантава з яго насмешкамі – справа гонару ваеннага чалавека. Але Лісаневіч адмаўляе нагавор выклікаць Лермантава на дуэль, сцвярджаючы, што той адносіцца да яго па-сяброўску, і калі паэт заходзіў у жартах занадта далёка, то заўсёды першым прасіў прабачэння. Чалавечая подласць знайшла сабе рэалізацыю ў іншай форме: з’явіліся размовы аб тым,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

што малады прапаршчык проста баіцца не столькі майстра слова, колькі добрага стралка [3, с. 122 – 124].

У. Караткевіч у сваім вершы ахарактарызаваў учынак С.Д. Лісаневіча як як праяву цывілізаванасці і культуры. Узняць руку на паэта-вастраслова не дазваляе ўнутраная духоўнасць і прыстойнасць Лісаневіча, які бачыць у асобе Лермантава «Слова Народа, Сэрца народа” [1, с. 23].

Зварот да творчых постацяў выяўляе на дзіва багаты духоўны свет У.Караткевіча, яго эрудыцыю, здольнасць захапляцца талентам іншых, па-мастацку засвойваць сусветны культурны вопыт. Як прыклад, перакладчыцкая праца, наследаванні, стылізацыі і іншыя формы мастацкіх узаемасувязяў. Згадаем верш «Наследаванне Байрану», напісаны ў стылі любоўнай лірыкі англійскага пісьменніка. Адметнасць гэтага стылю выяўляецца ў своеасаблівай паэтычнай вобразнасці [2, с. 88], якая моцна адчувальная і ў вершы У.Караткевіча: “стрэлы вей”, “саван бітвы”, “зіма трывог”, “зноў ёсць бой”, “сны завей” і інш.

У вершы “Бекеш, або Ода ерасі” У.Караткевіч актуалізуе праблему свабоды чалавечага мыслення, сцвярджае тэзіс пра сілу чалавечага духу і прывабнасць чалавека-гуманіста.

Такім чынам, аналіз асобных вершаў са зборніка “Быў. Ёсць. Буду”, у якіх цэнтральным вобразам становіцца творца, філосаф-гуманіст, дапамагае зразумець аўтарскую канцэпцыю гісторыі, выявіць сістэму духоўных каштоўнасцяў У.Караткевіча, раскрывае філасофскі падыход аўтара да асэнсавання ўсеагульных праблем сучаснага свету.

---


1. Караткевіч, У. Быў. Ёсць. Буду: Кніга паэзіі / У. Караткевіч; прадм. Р. Барадуліна. – Мн. : Мастацкая літаратура, 1997. – 157 с.

2. Иванова, Т.А. Лермонтов на Кавказе: Эссе / Т.А. Иванова. – М. : Художественная литература, 1975. –252 с.

3. Лермонтов М.Ю. в воспоминаниях современников / М.Ю. Лермонтов. – М. : Художественная литература, 1989. – 672 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. Кургинян, М.С. Джордж Байрон: Критико-биографический очерк / М.С. Кургинян. – М. : Художественная литература, 1958. – 216 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ